# Хто самы мужны студэнт?

**На гэта пытанне шукалі адказ у Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А.А. Куляшова. Пераможцу вызначыў традыцыйны конкурс «Гонар і мужнасць – 2022».**

Усім сёлета прынялі ўдзел шэсць студэнтаў розных факультэтаў. Падчас творчага спаборніцтва яны сталі героямі серыяла «Вострыя брылі» і прымерылі на сябе модныя ў пачатку XX стагоддзя вобразы, яскрава прадэманстравалі асабістыя living разнабаковыя таленты.

– Конкурс «Гонар і мужнасць» праводзіцца раз у два гады. Мы яго чаргуем з конкурсам «Універсітэцкая прыгажуня». Акцэнт робім на папулярызацыю роднай мовы. Штогод у кожнага з іх свая тэматыка, – гаворыць начальнік аддзела па выхаваўчай рабоце з моладдзю МДУ імя А.А. Куляшова Кацярына Сапетава. – Гэты конкурс заўжды цікавы і доўгачаканы. Нашы ўдзельнікі рыхтуюцца да яго вельмі адказна, а падчас розных выпрабаванняў імкнуцца паказаць свае здольнасці. Яны і дэфіліруюць па сцэне, і яскрава ўдзельнічаюць у творчых конкурсах. Вельмі цікава было паслухаць, як кожны студэнт, калі расказваў пра сябе, узгадваў гісторыю сваёй сям'і. У Год гістарычнай памяці гэта тэма асабліва актуальная. Шмат станоўчых эмоцый і ўражанняў дораць такія сустрэчы.

Строгае журы з розных сфер дзейнасці ўважліва сачыла за канкурсантамі. Гледачы не скупіліся на эмоцыі, падтрымлівалі ўдзельнікаў. Безумоўна, кожны з іх быў папсвойму цікавым, а фірменную статуэтку конкурсу атрымаў студэнт факультэта фізвыхавання Дзмітрый Янчанка. Усе ўдзельнікі атрымалі падарункі ад спонсараў.

– Люблю спорт з дзяцінства. Эквілібрыстыкай займаюся другі год і ўжо авалодаў многімі прыёмамі. Безумоўна, спадзяваўся толькі на перамогу. Вельмі адказна рыхтаваўся да ўдзелу ў конкурсе на працягу двух месяцаў. Рады, што ўсё атрымалася! – падзяліўся сваімі ўражаннямі пераможца Дзмітрый Янчанка.

**Таццяна ПАДЛІПСКАЯ.**
*Фота аўтара.*



